Спорт-тайм

# ФУТБАЛІСТЫ МІНСКАГА «ДЫНАМА» — ЧЭМПІЁНЫ БЕЛАРУСІ

## У традыцыйным аглядзе «Звязды» расказваем важныя спартыўныя навіны

**ПЕРАМОГА ТЫДНЯ.** Футбалісты мінскага «Дынама» датэрмінова выйгралі чэмпіянат Беларусі. У рамках 29-га тура нацыянальнага першынства краіны мінчане абыгралі бабруйскую «Белшыну». Вынік матча, які прайшоў у Бабруйску, — 4:0. Аўтарамі галоў сталі Аляксандр Сачыўка, Іван Бахар, Аляксей Гаўрыловіч і Данііл Зорын. Да гэтага «Дынама-Мінск» станавіліся чэмпіёнамі 19 гадоў таму.



Фота «Дынама-Мінск».

**АБ'ЯВА ТЫДНЯ.** Міжнародная федэрацыя коннага спорту (FEI) допусціла беларускіх і расійскіх спартсменаў да спаборніцтваў у нейтральным статусе. Умовы і тэрміны рэалізацыі гэтага рашэння будуць прапанаваны на зацвярджэнне выканкаму FEI падчас тэлеканферэнцыі ў снежні 2023 года.

**ПОСПЕХ ТЫДНЯ.** Чэмпіён Беларусі па гандболе «Мяшкоў Брэст» другі раз запар перамог ЦСКА і выйшаў на першае месца ў групе А SEHA-лігі. Брэсцкія гандбалісты адолелі маскоўскіх сапернікаў з вынікам 25:23. У групе В мінскі СКА другі раз запар перамог «Бусла Кітая» — 34:26. Цяпер, маючы ў сваім актыве восем балаў, мяшкоўцы знаходзяцца на першым месцы ў групе. Наступныя паядынкі першага этапа чэмпіянату SEHA-лігі адбудуцца 6—10 снежня. Групавы этап завершыцца ў пачатку лютага 2024 года, пасля чаго лепшыя каманды прадоўжаць барацьбу за ўзнагароды.

**ДЭБЮТ ТЫДНЯ.** Салігорскі «Шахцёр» ярка дэбютаваў у чэмпіянаце Расіі па баскетболе 3х3. Упершыню выступаючы сярод наймацнейшых расійскіх каманд, беларусы выйгралі ва ўсіх матчах. На групавым этапе спаборніцтваў Максім Каратцоў, Антон Зарэцкі і Максім Сазонаў па чарзе перамаглі маскоўскі клуб «Паўночны» — 21:12 і «Уралец» са Залатавуста — 21:4. У матчы за выхад у наступны этап спаборніцтваў беларусы перамаглі «ЦСП «Обнінск» з лікам 21:12. Наступны этап расійскага чэмпіянату пройдзе 12—13 снежня ў Архангельску. Чэмпіён і прызёры вызначацца ў пачатку чэрвеня 2024 года. Салігорскі «Шахцёр» стаў першым у гісторыі замежным клубам, які выступае ў чэмпіянаце Расіі па баскетболе 3х3. Ён з'яўляецца базавай камандай нацыянальнай зборнай Беларусі.

**МЕДАЛІ ТЫДНЯ.** У цэнтры водных відаў спорту «Неўская хваля» ў Санкт-Пецярбургу завяршыўся адкрыты чэмпіянат Расіі па плаванні на кароткай вадзе, удзел у якім прынялі і беларускія спартсмены. Ілья Шымановіч заваяваў залаты медаль на дыстанцыі 50 метраў брасам. Таксама лідар беларускай зборнай стаў сярэбраным прызёрам на стаметроўцы брасам. Аліна Змушко заваявала «серабро» на дыстанцыі 200 метраў брасам. У яе актыве таксама сярэбраныя медалі на стаметроўцы і на 50 метрах брасам. Беларускія плыўцы таксама сталі другімі ў мужчынскай камбінаванай эстафеце 4х50 метраў, дзе нашу краіну прадстаўлялі Віктар Стасяловіч, Рыгор Пякарскі, Ілья Шымановіч і Руслан Скамарошка.

**ГЕРОІ ТЫДНЯ.** Пяцёра беларускіх спартсменаў выступілі на маладзёжным чэмпіянаце свету па цяжкай атлетыцы. Ігнат Паўлюкавец стаў сярэбраным прызёрам у катэгорыі да 89 кг. Ягор Папоў заваяваў «бронзу» ў катэгорыі да 67 кг.

**ЛІЧБА ТЫДНЯ.** 21 медаль заваявалі беларусы на міжнародным турніры па боксе памяці В. І. Лівенцава, які прайшоў у Мінску. У актыве беларусаў сем залатых медалёў. Іх заваявалі Уладзіслаў Смяглікаў, Дзяніс Салоцкіх, Яна Бурым, Ала Івашкевіч, Арына Данільчык, Аліна Вебер і Вікторыя Кебікава.Сярэбранымі прызёрамі сталі Арцём Орсіч, Раміл Аліеў, Артур Тунеў, Марыя Піліпенка, Таццяна Трушкіна і Улада Базылевіч. Трэція месцы ў сваіх вагавых катэгорыях занялі Іван Захаранкаў, Аляксандр Доўнар, Кірыл Самадураў, Уладзіслаў Марчык, Маргарыта Банюшэвіч, Аляксандра Карповіч, Вікторыя Тэліман і Маргарыта Кісялёва. У міжнародным турніры памяці Віктара Лівенцава ўзялі ўдзел баксёры з Беларусі, Расіі, Таджыкістана, Кыргызстана, Казахстана, Кітая, Туркменістана і Конга, якія разыгралі 20 камплектаў медалёў (12 — у мужчын і восем — у жанчын).

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| **Мінск —** | 8.59 | 16.55 | 7.56 |
| **Віцебск —** | 8.55 | 16.38 | 7.43 |
| **Магілёў —** | 8.49 | 16.45 | 7.56 |
| **Гомель —** | 8.38 | 16.49 | 8.11 |
| **Гродна —** | 9.13 | 17.11 | 7.58 |
| **Брэст —** | 9.07 | 17.20 | 8.13 |

## Месяц

*Поўня 27 лістапада.*
*Месяц у сузор'і Блізнят.*

## Імяніны

*Пр.* ПАЧАТАК ВЯЛІКАГА ПОСТУ. *Дзмітрыя, Мікалая, Мікіты, Пятра, Рыгора.*
*К. Здзіслава, Рыгора, Сцяпана, Якуба.*


Фота Ірыны СІДАРОК.

# ЗАЎТРА




# Даты Падзеі Людзі

## 28 ЛІСТАПАДА

У краіне

**1748** год — граматай караля Аўгуста III члену Мінскага магістрата Яну Давіду Шэйбу было дазволена адкрыць аптэку агульнага карыстання — «для поратованья здоровья людей духовного, светского сану, в том городе живущих, так и для всего воеводства Минского». Каралеўскі герб над ёй быў устаноўлены ў знак манапольнага права на продаж медыкаментаў. Аптэка была вельмі патрэбная гораду, але галоўнай прычынай было тое, што ў Мінску праходзілі пасяджэнні Галоўнага трыбунала Вялікага Княства Літоўскага. У горад прыязджалі кароль і дэпутаты з усяго княства, і ў выпадку хваробы такіх высокапастаўленых асоб звярнуцца па лекі не было куды. Аптэкару, а гэта быў член Мінскага магістрата Ян Давід Шэйб, былі дадзены вялікія льготы, ён поўнасцю вызваляўся ад нясення гарадскіх павіннасцяў. Іншым жа асобам стварыць аптэкі не дазвалялася. Аптэка Шэйба 34 гады была адзінай у горадзе. І толькі ў 1782 годзе быў дадзены дазвол на адкрыццё ў Мінску яшчэ адной аптэкі.

**1918** год — створана Мінская ваенная акруга. 2 кастрычніка 1926 года ператорвана ў Беларускую ваенную акругу. У 1950-я і наступныя гады Беларуская ваенная акруга (адна з найбуйнейшых ваенных акруг Узброеных Сіл СССР) пераўтвараецца ў своеасаблівы доследны палігон для асваення новых узораў узбраення і баявой тэхнікі. Гэта тлумачыцца тым, што БВА прыкрывала найважнейшы (заходні) стратэгічны кірунак краіны і з'яўлялася «буферный» зонай у выпадку атакі. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 22 лютага 1968 года Беларуская ваенная акруга ўзнагароджана ордэнам Чырвонага Сцяга. Чырванасцяжная Беларуская ваенная акруга скасавана 6 мая 1992 года ў сувязі са стварэннем незалежнай Рэспублікі Беларусь. Часці і асабовы склад акругі склалі аснову Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

**1958** год — нарадзіўся (г. Брэст) Уладзімір Мікалаевіч Карват, першы Герой Беларусі (1996). У 1981—1994 гадах служыў у ВПС на Далёкім Усходзе: камандзір звяна, эскадрыллі, намеснік камандзіра палка па лётнай падрыхтоўцы. Са жніўня 1994-га — ва Узброеных Сілах Беларусі, начальнік паветрана-агнявой і тактычнай падрыхтоўкі авіябазы. Падчас начнога вучэбнага палёту 23 мая 1996 года падпалкоўнік Карват адвёў свой самалёт, які страціў кіраванне і загарэўся, ад вёскі Вялікае Гацішча Баранавіцкага раёна і загінуў.



У свеце

**1820** год — нарадзіўся Фрыдрых Энгельс, нямецкі філосаф, гісторык, палітык, заснавальнік камуністычнай ідэалогіі.

**1880** год — нарадзіўся Аляксандр Блок, рускі паэт, пісьменнік, публіцыст, драматург, перакладчык, літаратурны крытык, класік рускай літаратуры.

**1943** год — пачалася Тэгеранская канферэнцыя кіраўнікоў трох саюзных дзяржаў у Другой сусветнай вайне: СССР (І. В. Сталін), ЗША (Ф. Д. Рузвельт) і Вялікабрытаніі (У. Чэрчыль). Прыняты Дэкларацыя аб сумесных дзеяннях у вайне супраць Германіі і пасляваенным супрацоўніцтве, рашэнне аб адкрыцці другога фронту ў Еўропе, аб пасляваенных граніцах Польшчы і іншыя пытанні.

Так гаварыў...

**ЛЮДВІГ БЁРНС:**

*«Справядлівасць —*
*такі ж неабходны для жыцця прадукт,*
*як і хлеб».*



Шаноўнай лучынцы (бо з вёскі Лучын Рагачоўскага раёна) **Соф'і Парфір'еўне КУСЯНКОВАЙ**, адданай падпісчыцы і актыўнай аўтарцы «Звязды», найшчырэйшыя віншаванні з прыгожай круглай датай!.. Разам з пажаданнямі моцнага здароўя, бадзёрасці, новых творчых поспехаў!

*Каб зоркі падалі ў руку,*
*Каб вам*
*ва ўсім*
*спрыяла неба!*
*І каб хапала ў кашальку*
*На ўсе*
*надзённыя патрэбы!*

**Звяздоўцы,**
**сябры з Мінска, Беразіно, Гомеля, Чавусаў**
**ды іншых гарадоў і вёсак краіны.**

## УСМІХНЕМСЯ



**Навінка! Кніга! Унікальны, прынцыпова новы для моладзі носьбіт інфармацыі! Інфармацыя перадаецца ў мозг напрамую праз вочы! Ніякіх USB, Wi-Fi і IK-партоў.**

— Не плач! Ты зусім не тоўстая.
— Чаму ты вырашыў, што плакаць можна толькі з-за вагі?
— Ну, я пачаў з відавочных версій...

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.346. Індэкс 63850. Зак. № 2639.

Нумар падпісаны ў 19.30 27 лістапада 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12